Цана асобнага нумару 15 гр. | Przesyłka opłacona ryczałtem.

№ 72 (123). | Вільня, Серада 5 Кастрычніка 1927 г. | Год III.

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Няхай жыве Беларускі Народ!

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, ЗАВАЛЬНАЯ 6. (Wilno, Zawalna 6.).
Рэдакцыя адчынена штодня ад 9 да 3 гадзіны апрача сьвята.
Рэдактар прыймае ад 12 да 2 гадз.

Зямля Сялянству бяз выкупу!

Падпіска:
на адзін месяц — 1 зал., на 3 месяцы — 2 зал., на 6 месяцау 4 зал., на год — 8 зал.
Для заграніцы удвая даражэй.
Аплата надрукаваньня залежыць ад рэдакцыі
ВЫХОДЗЕ Ў СЕРАДУ І СУБОТУ.

ОРГАН БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСКАГА САЮЗУ.

Патрэба крэдыту.

У цяперашнім капіталістычным ладзе ўсё гаспадарчае жыцьцё пачынае апірацца на банкавых капіталах. Банкавыя капіталы забіраюць у свае рукі амаль-што большасьць вытворства і звароту гаспадарчага дабра. Гэтыя капіталы адыгрываюць сваю ролю праз пасярэдніцтва інстытуцыі—крэдыту, ці інакш паверу. Павер ёсьць адным з дзейнікаў, які пазваляе выкарыстаць прыродныя багацтвы і сілы прыроды, а таксама прытарнаваць людзкую працу. Калі ходзе аб прамысловае вытворства і гандаль, а на'т і буйнае земляробства, дык яны ўжо даўно карыстаюцца з дабрадзейства паверу. Інакш справа з дробным земляробствам. Дробныя земляробы—сяляне, а асабліва ў нас на Беларусі, яшчэ вельмі мала карысталіся дагэтуль з крэдыту, хоць ад часу скасаваньня прыгону ўжо патрабавалі яго. Селяніну немагчыма было дастаць крэдыту, бо банкі, якія распараджаліся грашыма, не хацелі мець спраў з дробнымі земляробамі, а памагалі толькі фабрыкантам і абшарнікам, атрымліваючы пры гэтым высокія прыбыткі. Толькі пад канец апошняга стагодзьдзя пачалі ўзьнікаць і пашыраць думкі аб стварэньні крэдыту для бяднейшых клясаў жыхарства. Гэтыя думкі скора знайшлі шмат староннікаў сярод грамадзкіх палітычных дзеячаў і затым пачалі рэалізавацца. Рэалізацыя пайшла даволі шпаркім крокам уперад і абняла г. зв. коопэратыўны рух. Праз коопэрацыю бяднейшыя клясы пачалі дабівацца крэдыту для сябе.

Беларускае сялянства, што апынулася пад Польшчаю, нязвычайна востра адчувае недахват гатоўкі і наагул варстату працы, і затым крэдыт ёсьць надта яму патрэбны. Крэдыт патрэбны і на адбудову зьнішчаных вайной гаспадарак і на закуп жывога і мёртвага інвэнтара і на навозы і г. д. Істнуючыя ў Польшчы крэдытныя ўстановы дагэтуль зусім не зьвярталі ўвагі на патрэбы нашага сялянства, памагалі толькі абшарнікам, шляхце і асаднікам. Селянін наш і тут астаўся пакрыўджаным. Ня маючы сваей дзяржавы і сваей цэнтральнай павернай касы, мы ня можам нічога адразу стварыць, каб можна было задаволіць усе патрэбы нашага сялянства ў крэдыце. Пытаньне аб крэдыце можам разьвязваць толькі паступова праз г. зв. коопэрацыю. Трэба, каб усё наша грамадзянства аддало ўсё, што можа аддаць, каб стварыць сваю цэнтральную крэдытную ўстанову, якая можа прыйсьці на помач тым, якія найбольш у даную часіну патрабуюць крэдыту. Толькі такой дарогай праз супольную акцыю ўсяго грамадзянства, праз масовыя запісі ў сябры сваей крэдытавай цэнтральнай установы, можна паступова тварыць банкавы капітал, які будзе служыць беларускаму грамадзянству.

Пачатак у гэтай працы ўжо зроблены. З ініцыятывы Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ўжо апрацаваны і прыняты статут Беларускага Коопэратыўнага Земляробска-Прамысловага Банку. Абавязкам кожнага шчырага Беларуса павінна быць ахвота стацца сябрам свайго банку і сваім, хоць невялікім, паем прычыніцца да помачы нашаму гаротнаму і сялянству, і рамесьнікам, работнікам, каб даць ім варстат працы, каб па магчымасьці, хоць часткова, вызваляць іх з безрабоцьця і галіты.

Маючы на ўвеце гэтыя сьвятыя мэты паляпшэньня долі найбольш пакрыўджаных Беларусаў, усе мы павінны натужыцца, зьберагчы хоць невялічкую суму грошай і аддаць іх у Беларускі Земляробска-Прамысловы Банк, ці то ў форме пая, ці ў форме ўкладу на той ці іншы рахунак. Усе гэтыя грошы будуць маемасьцю таго, хто іх улажыў, будуць сьцерагчыся лепш, чымся іх можа ўсьцерагчы сам гаспадар, і апрача таго, на карысьць гаспадара, яны будуць яшчэ прыносіць процанты. Адначасна з гэтым уложаныя грошы будуць прыносіць карысьць і тым, якія будуць іх браць на тыя ці іншыя патрэбы.

Дык вось, як бачым, Беларускі Банк будзе прыносіць карысьць, як адным так і другім, і будзе адначасна адбудоўваць нашу Бацькаўшчыну, падымаць яе ўсё вышэй і вышэй, аж пакуль ня стане яна роўнай у сям'і вольных народаў.

Адам Більдзюкевіч.

Пісьмо маршалка Сойму Ратая.

Маршалак Сойму Ратай апрацаваў пісьмо, якое мае быць адказам на пісьмо старшыні рады міністраў марш. Пілсудскага ў справе адхіленьня праз Сойм дэкрэтаў Прэзыдэнта Рэчыпаспалітай адносна прэсы. Тэкст гэтага пісьма яшчэ не агалошаны.

Пісьмо марш. Ратая складаецца з трох пунктаў.

У першым марш. Ратай сьцьвярджае, што пастанова Сойму ў справе адхіленьня дэкрэту Прэзыдэнта Рэчыпаспалітай аб прэсе, зроблена згодна з уставай, і інтэрвэнцыя Сэнату не абавязкова патрэбна.

У другім адзначае, што першая ўстава аб прэсе ў с. г. была адкінута праз Сойм і Сэнат аднак-жа гэта не павінна быць працэдэнсам.

Урэшце ў трэцім пункце сьцьвярджае, што пастанова Сойму ад 19-га верасьня с. г.—дакачана згодна з канстытуцыяй і рэгулямінам і афіцыяльна пададзена ўраду дзеля выкананьня.

Проці прэсавага дэкрэту.

Як ведама, ня гледзячы на скасаваньне Соймам прэсавага дэкрэту, гэты дэкрэт і далей абавязвае. У сувязі з гэтым 29 верасьня адбылося паседжаньне ўправы варшаўскага сындыкату журналістых, на якім аднагалосна пастаноўлена выказаць глыбокі жаль з тае прычыны, што ўрад адцягвае выкананьне пастановы Сойму аб скасаваньні дэкрэту.

Праца сабраньня Лігі Народаў закончылася.

27-га верасьня с. г. а гадзіне 13-ай старшыня Квані закрыў VIII сабраньне Лігі Народаў. У сваей канцавой прамове ён падкрэсьліў, што сёлетняя праца Лігі ўва ўсіх справах адзначылася вялікай жывасьцю і пасьпехам. Справа падгатоўкі міжнароднай канфэрэнцыі разаружэньня знайшла на гэтай сэсіі вялікае і шчырае падтрыманьне. Усе аказваюць вялікую ахвоту спыненьня шалёнай дзікасьці, якой зьяўляецца сучасная вайна. Заканчваючы сваю прамову Квані кажа: „Не далёка тая гадзіна, калі будзем магчы зьбіраць плады пасеяннага зерня". Словы яго сабраньне прыняло бурнымі воплескамі.

Савецкая палітыка

Парыжская прэса, абгаварваючы новую ноту савецкага пасла Ракоўскага ў справе апошніх прапазыкаў савецкіх, сьцьвярджае перш-на-перш факт, што справа звароту старых даўгоў расейскіх і справа прызнаньня для Расеі крэдытаў, у гэтай ноце цесна зьвязаны між сабой. Паводле газэт—прапазыкі савецкія не здаволюць ані тых, хто мае расейскую рэнту, ані прамыслоўцаў, якія, як піша „Echo de Paris", перад тым, як уверацць у цуд савецкага рынку,—прыпомняць сабе нешчасьлівыя спробы Англіі. „Matin" піша, што Саветы толькі падкрэсьлілі сваю двуасобасьць і выказалі яшчэ ясьней ахвоту да шантажу.

Агенцыя Гаваса даносіць, што прапазыкі, высунутыя Саветамі, у хуткім часе будуць разглядацца францускай дэлегацыяй на канфэрэнцыі ў справе францускіх даўгоў. Тэрмін паседжаньня францускай дэлегацыі яшчэ ня вызначаны.

Адазваньне савецкага пасла Ракоўскага з Парыжа.

Агенства „Экономіквэ эт Фінанціэрэ" даведваецца з Масквы праз Рыгу, што адазваньне Ракоўскага са становішча амбасадара савецкага ў Парыжы ўжо пастаноўлена аканчальна. Адазваньне мае быць уматывавана тым, што Ракоўскі неправідлова інфармаваў народны камісарыят замежных справаў аб перагаворах франдуска-савецкіх і гэтым выклікаў няўдалыя дэкларацыі Літвінава і адказы Францыі, пярэчучыя тым дэкларацыям. Саветы, быццам, маюць сарваць перагаворы з Францыяй, калі тая да 1-га студзеня 1928 г. ня прымець новых прапазыкаў савецкіх, нядаўна даручаных у Парыжы. Маскоўскі ўрад падсувае думку—высылкі праз францускі ўрад да Масквы спэцыяльнай камісіі, дзеля асабістых перагавораў з савецкім урадам.

З жыцьця Польшчы.

Пазыкі заграпічнай ня будзе.

Як пішуць з Варшавы, перагаворы ў справе пазыкі грошаў заграніцай не далі пажаданых рэзультатаў, быццам дзеля розьніцы эмісыйнага курсу.

З гэтага відаць, што Амэрыка ня верыць Польшчы і затым ня хоча ёй пазычаць грошы.

Зьмены на становішчы міністра асьветы (?).

У сфэрах зьбліжаных да ўраду разайшліся пагалоскі, быццам у хуткім часе наступіць зьмена на становішчы міністра асьветы. Д-р Добруцкі меў-бы заняць становішча Станіслаўскага ваяводы.

За магчымасьцю гэткіх зьмен гаварыў-бы факт канфэрэнцыі, якая адбылася між прэм'ерам і міністрам Добруцкім, а гэтак сама напад „Głosu Prawdy" на міністра асьветы.

Праца над пактам аб ненападаньні.

Міністэрства замежных справаў паведамляе, што апошнія перагаворы камісара замежных справаў Чычэрына з паслом Паткам давялі да ўзгадненьня некаторых пунктаў справы аб ненападаньні. Пасол Патэк выехаў на Каўказ, а як вернецца ў Маскву, ізноў у гэтай справе пачнуцца перагаворы.

Тэлефанічная камунікацыя з Саветамі.

Дня 27-га верасьня с. г. міністар Медзінскі прыняў на аўдыенцыі дэлегатаў нар. каміс. пошты і тэлеграфаў СССР. Бачарова, Шафраноўскага і Мэдэнова, якія прыехалі ў Варшаву з мэтай аканчальнага паразуменьня ў справе беспасрэднай тэлефанічнай камунікацыі паміж некаторымі местамі СССР. і Польшчай.

ГРАМАДЗЯНЕ, памажэце украінскім сялянам!

У пачатку верасьня с. г. на Украінскіх Землях пад Польшчаю здарылася страшэнная катастрофа, якая зьнiсьцiла зусім каля 1000 сялянскіх гаспадарак. Каля 1000 сялянскіх сем'яў асталіся пад голым небам, галодныя і халодныя. Шмат асоб катастрофа забрала на той сьвет. Украінскія арганізацыі і партыі арганізавалі адпаведныя камітэты дзеля помачы пацярпеўшым ад катастрофы.

Беларускія сяляне і ўсё беларускае грамадзянства павінна, у меру магчымасьці, таксама памагчы украінскім сялянам.

Рэдакцыя „Сялянскае Нівы" заклікае ўсіх прысылаць ахфяры на дапамогу Украінскаму Народу. За кожны ваш ахфяраваны грош будзе Украінскі Народ удзячны Беларускаму Народу.

Ахфяры прысылайце на адрас: Вільня, Завальная 6—5, Адміністрацыя „Сялянскае Нівы".

Што дзеецца ў сьвеце?

Камуністыя процi камуністых.

Цэнтральная кантрольная камісія расейскай камуністычнай партыі выключыла з партыі 5 сяброў: Фуртычэва, Пэргамэнта, Жураўлёва, Новікава і Рудчанкава, за апазыцыйную працу.

Як адзначае камісія, паседжаньні апазыцыяністых адбываюцца ў Маскве і далей. На гэтых паседжаньнях абгавараваецца палітыка савецкага ўраду і апрацоўваюцца апазыцыйныя дэклярацыі.

Выключэньне 14 сяброў з компартыі.

Прэсавая управа абвешчае пастанову прэзыдыума кантрольнае камісіі камуністычнае партыі аб выключэньні 14 апазыцыяністых, з прычыны залажэньня тайнай арганізацыі, якая мае на мэце разам з безпартыйнымі увайсьці ў зносіны з элемэнтамі варожымі саветам.

Паўстаньне ў СССР.

З Менску даносяць, што ў раёне блізкім эстонскай граніцы ўзьнікла сялянскае паўстаньне. Паўстанская арганізацыя мясьцілася ў вёсцы Кекна. Сяляне ўваружаныя карабінамі напалі на савецкія ўстановы. Зараз-жа прыбыла міліцыя і войска Г. П. У. і распачалася вайна з паўстанцамі.

Як даносяць з Рэуля, весткі гэтыя сьцьвярджаюцца адгалоскамі страляніны, якая была чутна на'т па старане эстонскай.

Контрдэманстранцыя камуністых у Бэрліне.

Бэрлінская камуністыя арганізуюць на дзень 80-ай гадаўшчыны нарадзін прэзыдэнта Гіндэнбурга вялікую контрдэманстранцыю, да ўдзелу ў якой зваюць усіх сваіх бэрлінскіх сяброў.

У сфэрах зьбліжаных да ўраду паўстаў непакой, каб не дайшло да нарушэньня спакою ў самую урачыстую хвілю.

Апошнія весткі падаюць, што паліцыя забараніла камуністым рабіць мітынгі і паходы ў гэты дзень.

Менскія госьці ў Празе.

Дня 14-га верасьня с. г. найвялікшы наш пясьняр Янка Купала прыехаў з Карлявых Вараў (Карлсбаду) ў Прагу. Разам з ім прыехалі ў Прагу пясьняр Чарот і пісьменнікі: Зарэцкі, Цішка Гартны. Паэтыцкае творства Янкі Купалы чэскім кругом знанае і добра ацэненае. У часе ягонае бытнасьці ў Празе найвялікшыя чэскія штодзенныя зьмясьцілі фатаграфіі Я. Купалы з шырокімі прыпіскамі.

Судовая кара на камуністых у Парыжы.

За антыдзяржаўную прапаганду сярод войска, суд засудзіў дэпутатаў камуністычных Дуцлёса і Марты на пяць гадоў вастрогу і кары па тры тысячы франкаў кожнага, а некалькі іншых камуністых — на тры гады вастрогу і па дзьве тысячы франкаў кожнага.

Замах у Белгародзе.

Як пішуць газэты з баўгарскага пагранічча, у Качані ў гатэлю, у якім месьцяцца ахвіцэрскі клюб, учора ўвечары знайшлі дзьве бомбы. Бомбы заўважаны былі загадзьдзя, і дзякуючы гэтаму, узрыву ня было. Гэты новы замах, які прыпісваюць македонскаму рэвалюцыйнаму камітэту, выклікаў у Белгародзе вялікае ўражэньне.

Тэрроры на Балканах.

Як даносяць з Белгароду на рынку ў Салёніках арыштавана двох сяброў баўгарскіх камітаджы, якія мелі на мэце выканаць некалькі замахаў. Знашлі пры іх па аднэй бомбе і па аднэй пякельнай машыне. Арыштаваныя прызналіся, што прыбылі ў Салёнікі каб узарваць югаслаўянскі кансулят, пасьля гэтага мелі паехаць у Белград і у Скопліе і ўзарваць там грэцкі кансулят. Гэткім способам мелі з'арганізаваць канфлікт паміж Грэцыяй і Югаславіяй.

З Афін, пішуць што яны апроч гэтага мелі узарваць магазыны з ваеннымі прыладамі ў Салёніках. У сувязі з гэтым граніца грэкабаўгарская закрылася.

Цела загубленых Сакко і Ванцэцьці переводзіцца ў Італію.

29-га верасьня Ванцецьці, сястра загубленага анархіста выехала караблём у Італію разам з целам загубленых Сакко і Ванцэцьцяга.

Манэўры літоўскага войска.

З Коўна даносяць, што 25 верасьня с. г. між Мар'ямполем і Глітай адбыліся манэўры літоўскага войска. У манэўрах з аднаго і другога боку бралі ўдзел: пяхота, конніца, цыклісты, а гэтаксама артылерыя і аэрапляны. Стычка была на 13 кілям. між Прэнамі і Глітай.

Вальдэмарас едзе ў Бэрлін

Як піша „Бэрлінэр Тагеблет" — літоўскі прэм'ер міністраў Вальдэмарас едзе ў Бэрлін каб вясьці далей перагаворы з Стрэзэманам.

Канкардат Літвы з Ватыканам.

Дня 27 верасьня с. г. у Ватыкане кардынал Гаспары і прэм'ер літоўскі Вальдэмарас падпісалі канкардат паміж Ватыканам і Літвой.

Паводка ў Швайцарыі

Як даносяць з Бэрну, у разьліву вады затапілася ў Таванасе 7 асоб, у Вайдэнбургу— 3 асобы, у княжастве Ліхтэнстэйн паводка зьнішчыла ўвесь ураджай і зьнясла некалькі мастоў. Цэлая ваколіца паміж Шаан а Шэльленбэргам—знаходзіцца пад вадою. Жыхары уцякаюць на стрэхі хат. Дзьве асобы ўтапіліся. На ратунак ахвярам паводкі прыбылі жаўнеры.

З прычыны разьліву Рэйна перарвана водная камунікацыя паміж Шафгаузенам і Бадэнскім возерам. Вуліцы ніжней часткі места Шафгаузена заліты вадой.

У Бухсе вада заняла ніжнія паверхі дамоў. Жыхары харонюцца на стрэхі. Адусюль чуваць крыкі завучых на ратунак.

ЯКУБ КОЛАС. 5)

Сымон Музыка.

Поэма.

(Працяг).

Ён ня меў нідзе нікога,
Хто-б схіліўся да яго.
Пастаяўшы хлопчык рушыў,
Піралез знаёмы плот,
Скрыпку ўзяўшы, і патрушыў
Упярод і ўсё ўпярод.
— Трэба, бацька, ведаць меру!
Хіба так ён вінават?
Дзе яму даць рады зьверу?
Ідзі кліч яго назад! —
Сэрца маткі ня ўтрывала:
— Хлопец з страху пабялеў,
Перапудзіўся ня мала,
За дзень гэты пастарэў.
— От, няхай там паскавыча;
Ня дзе дзенецца, ня йдзі:
Зьмерзьне, сам, нябось, прысмыча;
Сядзь ты лепей і сядзі. —
Толькі-ж маці не ўсядзела,
Выйшла ціхенька на двор.
— Дзе ты? — клікнула нясьмела.
Неба цёмнае бяз зор
Няпрыветна пазірала,
Цьма халодная маўчала,
Матцы кідала дакор
І папрокі ёй за тое,
Што пакрыўдзілі сынка.
І за што? за так пустое —
Ці-ж ухілішся ваўка?
Хлопца выгнаць, процiў ночы!
— Го-о, Сымон! — і ціха зноў!
І глядзяць дарэмна вочы
На куточках між платоў;
Вышаў бацька. — Ідзі ў хату.
Ня туляйся, а то — дам!
Чуеш! слухаць трэба тату!
Што хаваешся ты там?
Нябось, бачу! — Ды нічога
Ён ня бачыў і ня чуў.
А мрок-багна строга-строга
Неба, зямлю агарнуў.
Бацькаў гнеў даўно мінуўся.
Як ні страшыў ні гукаў,
Ды Сымонка не вярнуўся,
Слыху-голасу ня даў.

ЧАСЬЦЬ ДРУГАЯ

I

Калі вясною
Над зямлёю
Раняла сонейка праменьні,
Яно сказала ім тады:
„Ляцеце, промені, туды,
На баль мой выклічце стварэньні,
Удыхнеце дух ім маладзы,
Цяплом сагрэйце і каменьні,
Няхай зямля на ўсе лады
Сьпявае радасьць адраджэньня,
Няхай там зьнішчыцца суценьне,
Адбітак сьмерці і жуды".
І косы тыя
Агнявыя,
Свайму пакорныя закону,
Ляцяць з нязьмераных вышынь,
І жыватворная іх плынь
Зьняла цямраную заслону —
Зацяты сон нямых пустынь. —
Выходзь, зямля, з свайго прыгону,
Разьвей ты сон і чары скінь!
І ткуць праменьні ёй карону;
З свайго падзенмага амбону
Яе вянчае неба сінь...
Адна палоска,
Сонца коска,
Калі пустэлі пралятала,
Сустрэла хмарку на пуці.
„Спыніся промень, не ляці:
Сагрэта ўжо зямная гала,
Мяне ты, промень, асьвяці!"
Яна ад холаду дрыжала
І нікла ў жудаснай муці.
Праменю сонца шкода стала
Прыгожай хмаркі, што ўмаляла
Ёй косы сонцам запясьці.
І ён спыніўся
І скланіўся
Перад няшчасьцем хмаркі Божай:
Яна — адна, навокал — жуд,
Пякельны холад, мрок і мут.
І кінуў промень блеск свой гожа,
Нібы стварыў ён з ёю цуд:
Зазьяла хмарка так прыгожа,
Што хто ні бачыў як ні тут,
Зьвясьці вачэй з яе ня можа.
Ён з ёю дзеліць падарожжа.
Але завуць яго на суд.
За што? за тое,
Што сьвятое
Парушыў сонца прыказаньне
І, не дасягнуўшы зямлі,
Куды ўсе пасланы былі,
Каб зьнішчыць цьмы там панаваньне
Адстаў свавольна ад сям'і,
Разьліў свавольна сваё зьзяньне
У цэмры хмарчынай ральлі.
„Блукай-жа ты ў пустой далі!"
Ён быў асуджан на выгнаньне
І на бясконцае блуканьне
Паміж нябёсаў і зямлі.
Ноч над сьветам панавала.
Поле жудасна маўчала
І халоднай цішыняй
Няпрыветна сустрачала
Тых, хто з скрыўджанай душой
Смутак нёс свой, сваё гора
У сьвет гэты, гэту даль,
Каб расьсеяць на прасторы
Сьлёзы горкія і жаль
І ў дарозе між крыжамі
Гэты жаль узгадаваць,
Потым песьнямі, сьлязамі
Людзям зноў яго аддаць.
Шоў Сымонка на спатканьне
Змроку, цемрадзі палёў,
У круг гора і блуканьня
Мусіць лёс яго павёў.
І ён шоў — куды? ня ведаў
Ды аб тым і ня пытаў;
Пад убогі крыжык дзедаў
Неўзаметкі прыблукаў.
Тут ён толькі схамянуўся,
Стаў па трошку развазаць,
Пудка ў страсе азірнуўся —
Глуха могілкі ляжаць!
Ён прысеў на край магілы,
Скрыпку з боку палажыў
І заплакаў. — Дзедка мілы!
Ты адзін у сьвеце быў.
Да каго я прыхіліўся,
Ты адзін мяне ня гнаў
І ня крыўдзіў, не сьмяўся
І ў нядолі памагаў.
Голуб сівы мой! ачніся,
Пашкадуй мяне, дзядок! —
Плакаў хлопчык, і ліліся
Градам сьлёзы на пясок.
Плача, бедны, прычытае,
Вуха к долу прыхіне,
Ды маўчыць зямля сырая
І ў зацятай цішыне
Прычытаньне замірае.
Змогся хлопчык абясьсілеў,
Толькі ўсхліпваў ды ўздыхаў.
Ён сьлязамі жаль свой выліў,
Смутак імі спаласкаў.
І яму так лёгка стала,

НАВІНЫ.

— Канфіската „Сялянскае Нівы“. Па загаду Камісара Ураду на м. Вільню канфіскаваны № 71 (122) „Сялянскае Нівы“ за карэспандэнцыю „Усёткі засудзілі“.

— Беларускія лекцыі ў Браслаўшчыне. У нядзелю 25-га верасьня гр. К. Юхневіч—старшыня Гуртка Інстытуту ў Браславе прачытаў лекцыю у вёсцы Дзерукі, на тэму: „Гісторыя Беларусі“. Сялянства было вельмі задаволена з лекцыі. Наступная лекцыя мае адбыцца ў Шаўлянах, на тэму аб Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры.

— Беларускі Народны Тэатр. У Беларускім Народным тэатры што дзень адбываюцца рэпэтыцыі пад кіраўніцтвам мастака — артыстага.

За два тыдні маюць быць апрацаваны да пастаноўкі лепшыя беларускія сцэнічныя творы, а пасьля трупа выежджае на правінцыю.

— Бібліатэка Інстытуту. Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры прыступіў да залажэньня Цэнтральнай беларускай бібліатэкі у Вільні і зьбіраньня на гэтую мэту сродкаў.

На бібліатэку ўжо прыслана з Наваградзкага пав. ад гр. С. — 10 зл.

— Беларуская мова ў Барадзеніцкім касьцеле. Віленскага Арцыбіскупа Яблжыкоўскага, які 8 і 9 верасьня быў у Барадзенічах на візытацыі, адведала дэлегацыя ад барадзеніцкіх парахвіян.

Дэлегацыя прасіла Арцыбіскупа загадаць кс. Мажэйку ўзноў увясьці ў Барадзеніцкім касьцеле дадатковыя набажэнствы ў беларускай мове, якія, пасьля адкліканьня з парахвіі кс. Шутовіча, спынены кс. Мажэйкай.

Арцыбіскуп прыняў дэлегацыю вельмі ирыхільна і абяцаў споўніць просьбу, калі прынамсі чацьвертая часьць барадзеніцкіх парахвіян падпіша аб гэтым заяву. Дык прыпамінаем барадзеніцкім парахвіянам, што трэба парупіцца з подпісамі, якія зьбіраюць сябры дэлегацыі з Цяцерак і Шаўлян.

— Прыкрае здарэньне ў капліцы мэтадыстых. У прошлую нядзелю ў капліцы мэтадыстых на Троцкай вул. № 7 здарыўся прыкры выпадак.

А гадз. 12 м. 30 ў часе адправы набажэнства кс. Барташэвічам у капліцу ўвайшло некалькі падросткаў і кабет, якія сваім брыдкім захаваньнем парашкодзілі ксяндзу маліцца, накінуліся на кніжкі пачалі іх нішчыць, паламалі крыж і гразілі пабіцьцём.

Калі пазвалі паліцыю, авантурнікі ўмешаліся ў натоўп маленькікаў і часткамі выйшлі з капліцы, так што паліцыі неўдалося іх затрымаць. Затое ў панядзелак арыштавалі стаража магістрату Казіміра Лаўчыса, які прымаў удзел у гэтай авантуры.

— З'езд Караімаў у Троках. Прэзыдыюм віленскай караімскай гміны зьвярнуўся праз п. Віленскага Ваяводу ў Міністэрства В. Р. і О. П. ў справе дазволу на арганізаваньне 23 кастрычніка с. г. ў Троках агульнага З'езду Караімаў. З'езд гэты, калі толькі адбудзецца, будзе выбіраць галаву рэлігійнага зьвязку ў Польшчы — Гахана. Апрача выбараў Гахана будуць абгаварывацца культурна-асьвятавыя справы гэтай сэкты.

— Паверка рэзэрвістых. У часе ад 5 лістапада да 14 сьнежня с. г. на абшары Віленска-Троцкага павету будуць адбывацца кантрольныя сабраньні рэзэрвістых. Сабраньні гэтыя будуць адбывацца ў паасобных пунктах для некалькі валасцей разам:

Ад 5 да 11 лістапада ў Шумску для валасьцей: Міхаліскай, Варнянскай і Шумскай.

Ад 13 да 23 лістапада ў Нова-Вілейцы для валасьцей: Рэшанскай, Міцкунскай і Н.-Вілейкі.

Ад 25 лістапада да 1 сьнежня ў Алькеніках для валасьцей: Алькеніцкай, Коняўскай, Аранскай і Рудамінскай.

Ад 3 да 7 сьнежня ў Салечніках для валасьцей: Солечніцкай і Тургельскай.

Ад 9 да 14 сьнежня ў Падбржэзю для валасьцей: Мэйшагольскай Падбржэскай і Немэнчынскай.

— Змена раскладу язды. Віленская Чугуначная Дырэкцыя паведамляе, што ад 1-га кастрычніка с. г. мае наступіць зьмена ў раскладзе язды наступных цягнікоў пасажырскіх:

Цягнік № 311 — Вільня—Ліда—Лунінец—Здалбунова, які цяпер адходзе з Вільні а г. 6 м. 15 будзе адходзіць з Вільні а г. 7 м. 00.

Цягнік № 354 — Ліда—Вільня, які цяпер адходзе з Ліды а г. 5 м. 05 і прыходзе ў Вільню а г. 7 м. 40, будзе адходзіць з Ліды а г. 4 м. 45 і прыходзіць у Вільню а г. 7 м. 25.

Цягнік № 815/818 — Варшава—Сельцы—Ліда—Вільня, які цяпер адходзе з Ліды а гадз. 9 м. 00 і прыходзе ў Вільню а г. 11 м. 25, будзе адходзіць з Ліды а г. 9 м. 20 і прыходзіць у Вільню а г. 11 м. 40.

Цягнік № 412 — Маладэчна—Вільня, які адходзе цяпер з Маладэчна а г. 2 м. 40 і прыходзе ў Вільню а г. 6 м. 05, будзе адходзіць з Маладэчна а г. 3 м. 25 і прыходзіць у Вільню а гадз. 6 м. 55.

— Земскі ўрад Пастаўскага павету пераносіцца з Дунілавіч у Паставы. Усе інтэрэсанты павінны адрэсаваць заявы і зварочвацца ў Паставы.

Абмылкі.

У папярэднім нумары ў артыкуле „Новая гаспадарка“ здарыліся карэктарскія абмылкі: у радку 22-гім замест „убытку„ трэба „прыбытку“; у 43-цім—замест "момэнт" трэба „гаспадар“. У вестцы аб зьмесьце № 6—7 „Сахі“ замест „новы севажарт“ трэба „новы севазварот“.

Гаспадарскі аддзел.

Чарговая апрацоўка поля.

Пры нашым малазямельлі, нізкіх ураджаях і высіленых землях, спосабы апрацоўкі зямлі доўга яшчэ будуць мець асаблівае значэньне. Які спосаб мэханічнага вырабу зямлі нам ужываць, каб павысіць ураджайнасьць сваей нівы—вось, што мусіць цяпер цікавіць беларускага земляроба, які ўжо асвабадзіўся ад думкі, што гаспадарыць так, як гаспадарылі яго бацькі і дзяды, ёсьць згуба для яго.

Мэханічная апрацоўка зямлі робіцца дзеля таго, каб даць зямлі спрыяючыя ўмовы для розных працэсаў, вынікам якіх будзе падняцьце пладародзьдзя нівы.

У нас істнуе пагляд на зямлю, як на нешта мёртвае. Між тым, гэта зямелька, каля якой наш селянін гэтулькі кладзе цяжкай мазолістай працы, ня ёсьць мёртвае цела, бо ў ёй адбываюцца шмат карысных для земляроба працэсаў, як хімічныя, фізычныя і іншыя, ад дзеяньня якіх залежыць ураджайнасьць нівы.

Практыка і навука ўсталіла, што аднэй сваечаснай і правільнай апрацоўкай замлі можна падняць ураджай да 30%. Кожная апрацоўка зямлі мусіць перасьледаваць мэту, каб зямлю ператварыць у дробна-калікаваты стан. Толькі пры гэтым становішчы зямля лепш рэагуе на ўнесянае ўгнаеньне і дае гаспадару надзею, што яго цяжкая праца ня згіне дарма.

Па досьледам рожных дасьледчых станцыяў, найвялікшыя ўраджаі атрымліваюцца пры заворываньні зараз-жа пасьля здыйму ўраджаю. Чым гэта работа робіцца раней, тым лепш на гэта адклікаецца рост расьліны. Гэту ворку, якая заўсёды робіцца плытка, трэба зараз-жа пабаранаваць і трымаць ральлю ў спульхненым стане. Ад гэтае воркі найляпей нішчыцца дзікая трава—галоўны вораг сялянскіх палёў, паляпшаецца структура (будова) зямлі і лепш перапрэўваюць пажніўныя астачы.

Нашы сяляне заўсёды з гэтай воркай позьняцца. Часьцей усяго іржышча шкадуюць „псаваць“ як пашу для скаціны. Але гэта паша, чаго, пэўне, нашы сяляне ня ведаюць, дорага нам абходзіцца, бо гэтай пашай мы кожны раз трацім ня менш як 1/3 частку наступнага ўраджаю.

Больш усяго ворку зямлі пад яравыя ў нас робяць увосень. Гэту ворку трэба рабіць на поўную глыбіню, насколькі пазваляе таўшчыня ральлі, не баючыся трохі ўськінуць наверх дзікае зямлі. Паступовым паглыбеньнем восенскай воркі культурныя народы Заходу паднялі ўраджайнасьць сваей зямлі настолькі, што гэтыя ўраджаі для нас здаюцца немагчымымі.

І нам, Беларусам, трэба павялічваць сваю плошчу зямлі ў глыбіню. Выараная дзікая зямля (кожны год ня больш 1/4—1/2 вяршка) ад дзеяньня марозаў і іншых фактараў хутка зьмяняе сваю будову, колер і зьмешваецца з ворнай зямлёй.

Як-бы што яго ўзьняло
І так ціхенька гайдала
І так лёгенька нясло.
Вось узьняўся над крыжамі
І паплыў, паплыў, паплыў!
Толькі ветрык за вушамі
Ціха-ціха захадзіў.
А ён дальш усё нясецца,
Хмаркі гоняцца за ім
І сьмяюцца, ён сьмяецца
Сьмехам радасным такім.
А над імі сонца зьзяе,
Іх цалуе, як дзяцей,
І праменьні пасылае
Сустрачаць сваіх гасьцей.
Лёгка, вольна і лагодна,
Бы на крыльлях сьветлых мар,
Ен лятае так свабодна
У клубох купчастых хмар.
Але раптам стала зьмена:
У багнé пустых глыбінь
Бурнай плыні коціць пена
І чарнее неба сінь,
Нікне сонца ў чорным муту,
Хмаркі спуджана бягуць,
І з мінуты на мінуту
Сьвет затопіць тая жудзь.
А ён больш ляцець ня можа,
Страх яго апанаваў.
Толькі-ж чуе — гэтак гожа
Хтось на Скрыпцы заіграў.
  І вярнулася зноў сіла
Страху скінуты гужы.
Азірнуўся — зноў магілы
І пахілыя крыжы.
А на прыкладзе драўляным
Бачыць — сівенькі дзядок,
Дзед Курыла, ў бель убраны,
Галаву схіліў набок
І ўсё грае, ды так гожа,
Як ніхто яшчэ ня граў.
Ці ня дзедка з падарожжа
Небу скаргу пасылаў
За дзіцятка, што марнее
Бяз прызору, без бацькоў,
Што ня песьціць і ня грэе
Ласка мацеры, братоў?.
  Слухаў хлопчык сьпеў нязнаны
І нясьпеваны нікім,
І гаілісь сэрца раны,
Нікла крыўда перад ім.
А дзед грае, смыкам водзіць,
Плачуць струны і дрыжаць.
І такую жальбу родзяць,
Што ніхто ня мог стрываць:
І крыжы на дол прыпалі
І схінуўся верх лясоў
І граць дзеду памагалі
Хорам згодных галасоў.
А Сымонка, як прыкуты,
Ня мог пальцам зварухнуць,
Ня мог гэтых чараў путы
Ні разьбіць, ні адхінуць;
Толькі-ж чуў, што ня ўздужае
Дый ня схоча далей жыць,
Бо то дзедка выклікае
Яго душу сапачыць.
Вось-вось ён ужо канае
І ўжо чуе сьмерці ўзмах.
Ён ня плача, ня ўздыхае,
І яго не пашыбае
Ані жаласьць, ані страх,
Ды ў той час, калі, здавалась,
Дух яго ўжо пакідаў,
Дзіва новае зноў сталась:
Дзед у скрыпку ўлез, прапаў.
І сама ўжо скрыпка грала,
Покі лопнула струна.
А як лопнула — прапала
Сну праявіна — мана.
  Здрыгануўся, прахапіўся,
Галаву падняў Сымон.
  „Гэта-ж толькі сон мне сьніўся!“
І галоўку зьвесіў ён.
Азірнуўся — скрыпка збоку;
Праўда, лопнула струна.
То-ж сапраўды, ненарокам,
Аж яшчэ гудзе яна!

  Страшна, сьцішна хлопцу стала;
Увесь трosься ён, дрыжаў,
Песьня ў сэрцы не змаўкала,
Смутак гнеў у ёй гучаў.
Скрыпку ўзяў ён, азірнуўся,
Страх пашыб яго мацней,
Тут ён боязна прыгнуўся,
Ды з тых могілак — барждзэй,
Бег, пудліва азіраўся,
Ды зноў бег па камянёх;
Толькі ў полі затрымаўся,
Пастаяў на растанцох
Пад тым крыжам, дзе дарогі
Секлі сьледам сваім сьлед
Ды праз нетры і разлогі
Беглі дальш у белы сьвет.

Гэй, дарогі ў край шчасьлівы!
    Гэй дарогі
      Паясы!
Колькі ножак пранясьлі вы
    Праз аблогі,
      Праз лясы!
Гэй, дарогі, ніці-кросна,
    Тканкі кола
      І зямлі!
Як зацята-безгалосна
    Поўзьверх долу
      Вы ляглі!
Гэй, дарогі-пуцявіны.
    Чыёй волі
      Ву ганцы?
Што гамоняць каляіны
    І на полі
      Растанцы?
Вы паведайце нам былі,
    Што пісалі
      Вам тут дні;
Няхай скажуць вашы мілі,
    Як зьнікалі
      Тут агні!
Няхай скажуць вашы далі,
    Дзе звісае
      Мгла-туман:
Што яны нам абяцалі?
    Хто ня знае
      Гэты зман!

Гэй, дарогі ў чыстым полі,
Ніці шэрыя зямлі!
    Колькі к долі і нядолі
    Ног людзкіх вы пранясьлі!
Вышла-б казка, ды якая,
Каб маглі вы расказаць,
    То, што й думка не згадае,
    Што адным вам толькі знаць!
  Над Сымонкам думкі ўюцца:
Што рабіць? Куды пайсьці?
Ці назад дамоў вярнуцца,
Ці ў сьвет гора панясьці
Ды вялікі сьвет бясконца,
А ён — толькі мушка ў ім,
Лёгкі пыл у косках сонца,
У прасторы тонкі дым.
Чужаніца між сваімі,
„Непатрэбны дармаед“,
Як пагодзіцца з чужымі?
Як сустрэне яго сьвет?
І да дому-ж ён ня пойдзе
Зьдзек цярпець і сьпіну гнуць,
Долю знойдзе ці ня знойдзе —
Гайда ў пуць, далёкі пуць!

(Далей будзе.)

Добра было-бы ўжываць пры восенскай ворцы плуг з паглыбячом. Тут дзікая зямля наверх ня выкідваецца, а толькі ніжэйшыя слаі зямлі ўспульхняюцца. Замест паглыбяча, можна ўжываць і звычайны сялянскі плуг, якім ральля арэцца два разы па аднэй баразьне (ў два сьляды). Праходзячы з плугам другі раз па гатовай баразьне, трэба старацца, каб зямля ня ўскідвалася на верх. Ворку гэту астаўляюць не забаранаванай на зіму, каб лепш ральлю прабраў мароз.

Больш усяго на восенскую ворку адзываюцца кораньплоды і клубняплоды, як буракі, бульба і інш.

Думаецца, што ўсе спрэчкі аб тым, калі лепш араць пад ярыну—ўвосень, ці вясной—тут ня могуць мець месца.

Дык, сяляне, не запомніце пра гэту чарговую працу на полі.

Стары практык.

Весткі з Краю.

Вёска жадае беларускай школы.

(Браслаўшчына).

Польскія газэты вельмі часта падаюць тэндэнцыйныя весткі, асабліва эндэцкі „Dziennik Wileński", што селяне-Беларусы зусім здавальняюцца польскай школай і беларускіх не жадаюць, што самі кіраўнікі беларускіх інстытуцыяў і таварыстваў накідываюцца сялянству з беларускай школай, і як-бы фікцыйна гэта часамі робяць перад уладамі.

Дык вось для прыкладу пакажам эндэцы, што сама беларуская вёска дамагаецца сваей школы і, што польскія байкатуе. А трэба ведаць, што ў Браслаўшчыне, асабліва ў Ёдзкай воласьці найбольш праследаваюць мяйсцовыя ўлады Беларусаў-сялян за іх стойкасьць, сьведамасьць і дамаганьне сваіх школаў.

Аднак гэта іх ня ўстрымлівае і не замінае ім ісьці да сваей мэты.

Ёсьць у в. Шаўлянах беларуская прыватная школа, якая заложана ў прошлым годзе, хаця была адкрыта ў сакавіку, аднак сабралася дзяцей 54 асобы.

У гэтым-жа школьным годзе, ад пачатку верасьня пачало хадзіць акуратна ў школу больш сотні дзяцей, І што-раз болей наплывае кандыдатаў, але дзеля недахопу вялікага памешканьня больш не прыймаюцца дзеці ў школу. Трэба ведаць, што зусім блізка ад Шаўлян у суседніх вёсках існуюць польскія школы, але існуюць яны бадай бяз вучняў, бо ўсе паперaходзілі ў беларускую школу, не зважаючы на тое, што тут трэба плаціць за навуку. Нават шляхоцкія дзеці прыходзяць вучыцца ў беларускай школе. Пры гэтым трэба адцеміць, што дзеці прыходзяць у бел. школу за 3—4 вёрсты, пакідаючы ў сваіх вёсках польскія школы.

Паказалі на практыцы польскія школы нашаму сялянству, што з іх выходзіла дзіця, кончыўшы 6—7 аддзелаў зусім безграматным.

Цікава, што-б сказаў п. Обст з „Dziennika Wileńskiego", гледзячы на такое зьявішча?! Вось дзе яму загваздка!

Дык гарой, Беларусы-сяляне за родную школу!

Хай нашы дзеткі будуць граматныя, а не калекамі. Дамагайцеся ўсюды сваей роднай школы, якая дасьць карысьць неацэненую вашым дзеткам, вам і ўсяму Беларускаму Народу.

Марвіч.

Выбары ў свірскмую валасную Раду.

(Сьвянцянскі павет).

Ад часу выбараў новай валасной Рады, парадкі ў нашай воласьці зусім перамяніліся. Ужо ня чуваць прыказкі: „парадак як у Сьвірскай вол.", якая тут была ў модзе ў часе панаваньня б. войта Вайткевіча і старой Рады. Цяперашні войт адносіцца да сваіх абавязкаў шчыра, а і да сялян ветліва, а бяднейшых за каўнер ня выводзяць, як гэта часта было пры Вайткевічу і старой Радзе. У склад новай Рады ўвайшло 6 сьвядомых Беларусаў: Я. Нябескі з в. Куські, Міх. Самко і Ад. Адамовіч сябры Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры з в. Бортнікі, Ерофееў з м. Сьвір, а старшыня Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры Язэп Карэцкі прайшоў у соймік павятовы, апрача гэтых да Рады ўвайшоў 1 Жыд і некалькі несвядомых Беларусаў-каталікоў, якія сябе запісалі Палякамі, а фактычна Палякаў у іхнім родзе няма.

Беларускія прадстаўнікі дамагаюцца, ад гміннага ўраду добрых адносінаў да сялян, і лепшых парадкаў. Цяпер ня толькі ў воласьці, але і ў сойміку пачынае выяўляцца беларуская мова. Беларусы ў сойміку бароняць праваў Беларускага Народу.

Тутэйшы.

Цемната.

(Шутавічы, Ашм. пав.)

Пісалася ўжо ня раз у „С. Н." пра шутаўскіх Палякоў. Паслухайце яшчэ, хаця і нявaрта ўспамінаць аб такіх цнотах, але няхай сьвет знае, што і ў Шутавічах ёсьць яшчэ цемната. Ёсьць у нашай вёсцы „мікалаяўская" малалетка Рузя, каторая мае ўжо гадоў сорак. Здаецца, ўжо і розум павінна мець, але яго ні на грош нямае. Нічога ня робіць, а толькі меліць языком, як пустым млыном і займаецца рознымі брахнямі. Брэша ўсяк на гурток Б. І. Г. і К. Сяброў абзывае беларускай басатой і шмат чаго іншага, каторага і пісаць нявaрта.

Думаеце, што гэта толькі адна, але ёсьць і другая, Гэлька А. з каторай сьмех толькі бярэ. Кончыла яна ў Вільні нейкую ткацкую школу, цяпер займае пасаду недзе ў Польшы. Прыехаўшы дамоў на лета, ці якое сьвята, займаецца тым-жа самым, чым і вышэй успомненая Рузя. Прыехаўшы, на прыклад, у сваю вёску гавора, што ёй сьмярдзіць гэты край і яшчэ кажа, каб хто забіў аднаго Беларуса, дык паставіла-б 15 бутэляк гарэлкі. Проста аж ня верыцца, каб „адукаваная" дзяўчына займалася такімі брэднямі.

Усё гэта сьведчыць, што сярод нас яшчэ караніцца цемната і нясьведамасьць. Трэба верыць, што яшчэ пройдзе гадок у працы нашага гуртка Інстытуту і не астанецца ў Шутовічах ніводнай цёмнай асобы.

Сякі-такі.

Ганьба нашай моладзі.

В. Шэні, Пружаншчына.

Пад той час, як частка нашай моладзі ходаееца за дабро Бацькаўшчыны, і некалькі сьвядомых хлапцоў гніюць у польскіх вастрогах, большасьць атручваецца ў гарэлцы, разьбіваюць галовы; цягаюцца па суседніх вёсках шукаючы сабе „сабрацьцяў" з якімі, як яны кажуць, праводзяць дні „вясельля". Маладыя браты! Гэта хутчэй дні атруты, дні страты безкарыснага часу, падчас якога малады чалавек можа многа зрабіць дзеля дабра роднае старонкі... Як дзіка глядзець чалавеку, які гатоў усё аддаць дзеля палепшаньня дабрабыту сярмяжнікаў і які не баяўся пакутаваць, на гэтыя вясёласьці! Няма бібліатэкі, роднае школы, зямля ў асаднікаў, старонка ў руках чужынцаў, ярмо, якіх уелася да касьцей у сялянскую шыю—пра гэта нашым блазьнюкам галава не баліць. А ідуць да пана на работу за некалькі грашоў у дзень. Наракаюць на кепскае жыцьцё. Знайце браточкі, што пьянства да дабра не давядзець. А табе „фэст", як прэзэсу пьянства ганьба!! ганьба! і яшчэ раз ганьба!!

Мікалай Бедны.

Галілеюшы задзяракі і празывакі.

(Зарачы, Браслаўскага пав.).

Школьная ўлада, хочачы спалянізаваць Беларусаў, напрысылала на беларускія землі ў пачаткавыя школы вучыцялёў „галілеюшаў". Вучыцялёў-жа Беларусаў проста павыкідвалі са школаў тлумачучыся тым, што Беларусы ня маюць адпаведных кваліфікацыяў. Як Беларус, то па іхняму, пэўна-ж ня мае кваліфікацыі. Затое вучыцялі „галілеюшы" надта выкваліфікаваныя біць беларускіх дзяцей.

Як прыклад, магу тут успомніць, што ў школе ў Зарачах, Браслаўскага пав., ёсьць тры вучыцялі і адзін з іх К.—„галілеюш", каторы так „кваліфікуе" вучняў па галовах кніжкамі, ды рваньнем за вушы, што, тыя бедныя, без пары ўцякаюць са школы да хаты, акрамя таго яшчэ празывае дзяцей рознымі няпрызваітымі прозьвішчамі. Ня дрэнна было-б, каб школьны інспэктар у Браслаўі п. Прухнік пагутарыў з „p. Romanem" у справе біцьця дзяцей дый даў яму школу „w rodzinnej Galilei". Задзяракам і празывакам у нас ня месца.

Кароль Цыбук.

Угадоўцы.

(Пружаншчына).

Айцец Марцін Волкаў, быўшы балахоўскі ахвіцэр „господин Волков" вось ужо некалькі тыдняў паехаў у Карльсбад лячыцца...

Што-ж тут, здаецца, дзіўнага? Захварэў ну і паехаў лячыцца.

Але справа выглядае зусім інакш.—Сьвяшчэньнік Марцін Волкаў вось ужо 4 гады па назначэньню „свышэ" жывець у м. Сельцу Пружанскага пав. і адпраўляець набажэнства для вялізнага ў 15 тыс. душ прыходу. За ўвесь час сваей „службы" ён неяк вельмі ўжо спадабаўся і мясцовым каталіком і ўладзе. У той час, калі ўсё, магучае на польскі выгляд, перасьледуецца ўладамі, калі асабліва праваслаўныя Беларусы і духавенства так ненавідзімыя „папамі" М. Волкаў—гэта ідэал тутэйшага „панства".

І калі нешта занядужаў айцец (ці „пан"—пе разбярэш) Волкаў, дык улада асыгнавала грошаў на лячэньне, ды яшчэ і ў загранічных курортах! Дзіўна! Сапраўды-ж дзіўна ўсё робіцца на сьвеце. Калі амаль не на цэлы Пружанскі павет няма ані воднага дохтара, акрамя ў самай Пружане, і селянін калі захварэў (што часьцей яму здараецца, як папу), то або чакай сьмерці, або шукай якога дапатопнага знахара—улада ня зварочваець на гэта ніякае ўвагі, на гэта няма грошай, а вось таму хто ей карысны дык зараз-жа грошы знойдуцца...

Нятутэйшы.

Юрыдычныя парады

ў Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры.

Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры арганізаваў Юрыдычную Сэкцыю, якая мае на мэце даваць парады сялянству ў рожных справах, як цывільных, так і палітычных.

Юрыдычная Сэкцыя Інстытуту знаходзіцца пад кіраўніцтвам спэцыялістага юрыста і затым парады будуць насіць цалком характар адвакацкіх парадаў. Парады можна атрымліваць на месцы ў Вільні асабіста, а таксама дарогай карэспандэнцыйнай. **Кожная парада**, як вусная, так і лістовая **каштуе 50 грошай**. Незалежна ад парадаў Юрыдычная Сэкцыя Інстытуту, на жаданьне Інтэрэсантаў, можа арганізаваць судовую абарону ў цывільных і палітычных справах, якія разьбіраюцца, як на месцы ў Вільні, так і на правінцыі.

Зварачвацца на адрэс: **Вільня, Завальная 6—5, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, Юрыдычная Сэкцыя.**

НАШАЯ ПОШТА.

Аляксейчыку Пётру. — Ваш ліст падалі ў кнігарню „Пагоня"—Завальная 7.

Клочку Язэпу. — Француская рэгістрацыя адбылася ў 1921 годзе, здаецца вясной.

Я. Закінутаму. — Вашыя расказы цяпер не зьмяшчаем з прычыны друку „Сымова Музыкі". Пішэце кароткія карэспандэнцыі.

Скроцкаму-Ул., Гурскаму С. — Пробны нумар паслалі.

Міскевічу А. — Газэту пасылаем.

Дасталі ад:

Валожынскага староства — 2 зл.; Маслава Рыгора, Качана А. — па 1 зл.

КУТОК СЬМЕХУ.

* * *

Паліцыянт піша пратакол на гаспадара, што пускаў сабаку без каганца і кажа гаспадару:

— Падпішы пад пратакол за сабаку.

— Няхай сабака падпіша, бо я няпісьменны, — атказвае той.

Рэдактар і выдавец А. Герасімчук.

Беларуская Друкарня ім. Ф. Скарыны, Вільня—Людвісарская 1.